# Фестывалю «Берагіня» – увага!

***Сёлета 13 лістапада ў рамках правядзення этнаграфічных канцэртаў «Фальклор беларускай глыбінкі», якія ладзяцца Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры і мастацтваў, адбудзецца прэзентацыя Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня».***

Мэта прэзентацыі – папулярызацыя народнага мастацтва беларусаў і інавацыяў у галіне выхавання маладога пакалення сродкамі розных праяваў традыцыйнай народнай культуры. Фестываль скіраваны на дзяцей і моладзь, на іх патрыятычнае выхаванне сродкамі сапраўднай народнай спадчыны Беларусі. Арганізацыю і правядзенне фестывальных мерапрыемстваў падтрымліваюць міністэрствы культуры і адукацыі, Гомельскі аблвыканкам і Акцябрскі райвыканкам, грамадскае аб'яднанне «Беларускі фонд культуры». Апякуецца фестывалем і Нацыянальная камісія па справах ЮНЕСКА.

У падмурку фестывалю ляжыць навуковы падыход, які грунтуецца на прынцыпах комплекснасці, сістэмнасці і паслядоўнасці далучэння моладзі да карэннай культуры свайго краю. Удзельнікі фальклорнага фестывальнага руху самавыяўляюцца не толькі ў практычнай мастацкай творчасці, але і ў напісанні даследчых працаў, выступленні з імі на канферэнцыях.

Падчас прэзентацыі Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» адбудзецца **круглы стол па тэме «Традыцыйная культура і дзеці: праблемы захавання, аднаўлення і трансляцыі»**, дзе будуць абмяркоўвацца пытанні вывучэння і захавання традыцыйнай народнай культуры беларусаў, а таксама пераймання і трансляцыі нематэрыяльнай і матэрыяльнай культуры Бацькаўшчыны дзецьмі і моладдзю ў школьнай і пазашкольнай практыцы, у рэгіянальных установах мастацтва.

Удзельнікам мерапрыемства будуць прапанаваныя **выставы «Фоталетапіс “Берагіні” ў творчасці Я. Пясецкага, “Краязнаўчай газеты”, газеты “Чырвоны Кастрычнік”», «Сучасны стан і развіццё народнага мастацтва рэгіёнаў» і «Народнае мастацтва Акцябрскага раёна Гомельскай вобласці»**. Таксама пройдуць майстар-класы па традыцыйных відах народнага мастацтва Акцябршчыны і дэманстрацыя фестывальных фота- і відэаматэрыялаў, а таксама **канцэрт-прэзентацыя аўтэнтычных і дзіцячых фальклорных калектываў «Фальклор беларускай глыбінкі»**. На прэзентацыю Рэспубліканскага фестывалю фальклорнага мастацтва «Берагіня» запрашаюцца вядомыя навукоўцы, практыкі, спецыялісты сферы культуры, прадстаўнікі міністэрстваў адукацыі і культуры, навучальных установаў, СМІ, спецыялісты ўстановаў культуры краіны, кіраўнікі мастацкіх дэлегацыяў і фестывальных калектываў.

Урачыстасці пачнуцца 13 лістапада 2010 года ў Мінскім палацы культуры і спорту чыгуначнікаў (вул. Чкалава, 7) а 14-й гадзіне з круглага стала, а 16-й гадзіне адбудуцца прэзентацыі выставаў, канцэрт-прэзентацыя «Фальклор беларускай глыбінкі» пройдзе з 17-й да 19-й гадзіны.




РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ